# КРЫВІЯ

**Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі**

**№21 Сакавік - Травень 2011**

**Культурна-асьветніцкая газэта**


## ЗЬМЕСТ


**Беларуская Чэхія**
Дзень Волі ў Празе - ст. **1**
Сярэднявечныя інструмэнты Беларусі - ст. **2**

**Навіны з Бацькаўшчыны**
Гомельскія дэмакраты супраць чэмпіянату сьвету па гакеі ў Менску - ст. **3**
Натальля Радзіна пакінула межы Беларусі- ст. **3**
Абмежаваны доступ да дэмакратычных сайтаў - ст. **3**
Глеба для сумненьняў - ст. **4**
“Чарнобыльскі Шлях” не праводзіцца. - ст. **4**

**Беларусы ў сьвеце**
Наста Палажанка не спалохалася - ст. **5**
Дзень Волі ў замежжы - ст. **5**
Сьвет спачувае Беларусі - ст. **6**

**Беларусы Эўразьвязу**
Сапраўднае застанецца - ст. **7**
Закон аб беларускай дыяспары - ст. **7**

**Спорт** - ст. **8**


## Беларуская Чэхія




## Дзень Волі ў Празе

Праскія беларусы штогод адзначаюць гадавіну Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Сёньняшняя сьвяточная імпрэза ў гонар Акту 25 сакавіка 1918 г. адбылася ў самым цэнтры чэскай сталіцы, у найстарэйшай праскай царкве Сьвятых Кузьмы і Дзям’яна пачатку X ст.

Сьвяткаваньне пачалося з урачыстага набажэнства, у якім узяў удзел грэка-каталіцкі экзарх Чэхіі біскуп **Уладыслаў Гучка**. Была прачытаная малітва за Беларусь, якую напісаў айцец **Леў Гарошка**. Падчас набажэнства і пасьля, у сьвецкай частцы імпрэзы, сьпяваў міжпарафіяльны хор «Прасфара» пад кіраўніцтвам **Марысі Янушкевіч**. Гэта менскі хор, што прыехаў у Прагу адмыслова на сьвяткаваньне Дня волі.




У сьвяткаваньні прыняў удзел **Багдан Данілішын**. Гэта экс-міністар эканомікі Ўкраіны з ураду Юліі Цімашэнкі, які атрымаў палітычны прытулак у Чэхіі. У імпрэзе таксама ўдзельнічаў кандыдат на прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь на апошніх выбарах **Алесь Міхалевіч**, які таксама атрымаў палітычны прытулак у Чэхіі.

Падчас сьвяткаваньня **Вячаслаў Ракіцкі** прадставіў свой тэлевізійны праект для «Белсату» — «Сьцяна». Гэта 12 фільмаў-маналёгаў удзельнікаў мірнай акцыі пратэсту 19 сьнежня 2010 году, якія былі ў той жа вечар кінутыя ў турмы ці аштрафаваныя на вялікую суму грошай.

Імпрэзу вёў намесьнік старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі **Сяргей Навумчык**.

Сп. Навумчык таксама прачытаў галоўны даклад - на тэму дня.



*Выступае Алесь Міхалевіч*

Пасьля выступіў найноўшы сябра нашай грамады - былы прэзыдэнцкі кандыдат **Алесь Міхалевіч,** з разважаньнямі на тэму палітычнай сытуацыі ў Беларусі - пасьля падзеяў 19-га сьнежня 2010 г.

Уканцы выступіў "вэтэран" беларускае праскае грамады, былы старшыня суполкі Скарына, сп. **Юрка Станкевіч.** Ніжэй падаем вытрымкі зь ягонага выступленьня:

"... Найперш, хачу адзначыць, што мне найбольш прыемна, што, пасьля 7 год намаганьняў і спробаў, нам удалося адзначыць гэта сьвята РАЗАМ., а гэта - дзякуючы некаторым кампрамісам з абодвых бакоў, і ініцыятыве айца Андруся Абламейкі.

... У 1990-ых гадох беларускае грамадзкае жыцьцё ў Празе КІПЕЛА: ладзіліся штомесячныя зборкі, на якіх людзі пазнавалі адзін аднаго.

Праходзілі што-гадовыя акадэміі 25-га сакавіка ў Крыштальнай Капліцы, з удзелам ведамых гасьцей зь Беларусі, прыкладам Др. Алега Трусава. На іншых супольных сустрэчах бралі ўдзел Васіль Быкаў, Зянон Пазьняк, Івонка Сурвілла.

... Нажаль, улетку 2004 году зьявіліся некаторыя, можна сказаць, недарэчныя непаразуменьні, якя паступова давялі да расколу тутэйшай грамады. У выніку яго некаторыя, дагэтуль актыўныя сябры адыйшлі ад грамадзкае працы.

Прыемна аднак пабачыць некаторых зь іх на сёньняшняй акадэміі.

.. Уканцы застаецца пажадаць нашай грамадзе ў Празе і далей працягваць карысную **супольную** грамадзкую працу.

Калі й зьяяцца дробныя дэталі, у якіх розьнімся - напэўна зможам знайсьці кампрамісы, у духу УЗАЕМНАЙ ПАШАНЫ. "

*ЗАЎВАГА: Поўны (нескарочаны) тэкст прамовы сп. Станкевіча знойдзеце на вэб-старонцы* ***http:// www.pahonia.cz***

Акадэмія кончылася дзьвюхгадзінным канцэртам аўтара і выканаўцы ўласных песень **Яўгена Барышнікава**, які адмыслова прыехаў у Прагу на запрашэньне мясцовых беларусаў. Яўген іграў ня толькі на гітары, але й на дудзе. Дарэчы, на сёньняшні дзень Яўгена можна ўважаць адным зь перадавых адмыслоўцаў ***дуды*** - старадаўнага беларускага інструмэнту - як ігрою на ім, так і вырабам яго.

**Крыніцы:** Радыё Свабода, 26.03.2011, паасобныя ўдзельнікі сьвяточнае акадэміі.

## Сярэднявечныя інструмэнты Беларусі

19-га красавіка г.г. адбылася ў нашай клюбоўні (на вул. Žitná 32 ) прэзэнтацыя стужкі "Сярэднявечныя інструмэнты Беларусі." й сяброўская сустрэча зь ейным рэжысэрам, сп. Зьмітрам Сасноўскім.

Паказ стужкі трываў больш за гадзіну, з падрабязным апісаньнем ( ігры на іх і вырабу) гэткіх інструмэнтаў: ДУДА, ЛЮТНЯ, КОЛАВАЯ ЛІРА, ГУСЬЛІ, СУРМА.

Пасьля паказу стужкі сп. Сасноўскі прадэманстраваў ігру на дудзе - твораў з розных эўрапэйскіх рэгіёнаў і гістарычных пэрыядаў.

Ён-жа вельмі цікава распавёў аб удзеле свайго гурту СТАРЫ ОЛЬСА на міжнароднай сустрэчы гуртоў сярэднявечнай музыкі ў польскім гарадку ВОЛІНЕ, на беразе Балтыйскага мора.

Паказ стужкі прайшоў вельмі ўдала, карыстаючыся толькі-што набытым ПРАЕКТАРАМ.

У будучыні яго думаем выкарыстоўваць часта для паказу розных фільмаў і стужак.

**Пра**
**АПОШНІЯ ПАДЗЕІ**
**ў жыцьці беларускай Чэхіі**
*можна даведацца на старонцы*
**http://www.pahonia.cz,**

# НАВІНЫ з Бацькаўшчыны

## Гомельскія дэмакраты супраць Чэмпіянату сьвету па гакеі ў Менску

**Гомельскі Рух “За свабоду” намераны пазбавіць афіцыйны Мінск Чэмпіянату сьвету па гакеі, калі ня будуць вызваленыя ўсе палітвязьні. Кіраўнік абласной філіі “За свабоду” Пётр Кузняцоў выступіў з прапановай звароту ў Міжнародную федэрацыю гакея ад імя дэмакратаў Гомельшчыны.**

Актывісты праінфармуюць спартовых чыноўнікаў пра сапраўдную сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі пасьля апошніх прэзідэнцкіх выбараў.

**Пётр Кузняцоў**:

*-- Я добра разумею, што шмат хто зь беларусаў можа не падтрымаць гэтую ініцыятыву. Маўляў, апазіцыянеры хочуць пазбавіць Беларусь спартовага сьвята. Але, прынамсі, маё меркаваньне такое: калі ў краіне ёсьць палітычныя вязьні, для сучаснай дзяржавы – гэта жалоба. Гэта насамрэч жалоба і трагедыя таго маштабу, калі ўвогуле ўсе забаўляльныя мерапрыемствы трэба забараняць. Мы ня можам жыць надзеямі на нейкае сьвята, калі людзі бязьвінна знаходзяцца за кратамі.*

Прапанова аб звароце ў Міжнародную федэрацыю гакея з просьбай перагляду рашэньня аб месцы правядзеньня Чэмпіянату сьвету ў 2014 годзе была агучаная ў рамках Форуму дэмакратычных аб’яднаньняў Гомельшчыны. На другі дзень мерапрыемства, 13 сакавіка, будзе ўзгоднены і ўхвалены канчатковы варыянт тэксту ліста ў міжнародную арганізацыю, якая курыруе пытаньні гакея з шайбай ва ўсім сьвеце.

**Мікола Бянько, Радыё Рацыя.** 12-03-2011

## Натальля Радзіна пакінула межы Беларусі

**Па дадзеных сайту Хартыі-97, яго рэдактарка Натальля Радзіна, якая зьяўляецца абвінавачанай па справе аб масавых беспарадках, зьехала зь Беларусі і знаходзіцца ў бясьпечным месцы за межамі краіны.**

Па словах маці журналісткі Надзеі Максімаўны, дачка пакуль не званіла ёй, таму дзе знаходзіцца Натальля, яна ня ведае.

*- Не, яна мне не тэлефанавала. Я думаю, яна слушна зрабіла, таму што спакою ёй тут ня было б - ні працы, ні спакою. Лепш яна будзе на волі, чым у турме. Я рада. Таму што яе перасьледуюць ужо цэлы год. Гэтага ніхто не вытрымае. Гэта вельмі цяжкае выпрабаваньне. Гэта не адзін дзень і ня дваццаць.*

Натальля Радзіна абвінавачваецца ў арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках у Мінску 19 сьнежня 2010 году. Пасьля дэманстрацыі 19 сьнежня 2010 году супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў, падчас якой яна была моцна зьбіта, Радзіну арыштавалі і больш месяца трымалі ў ізалятары КДБ. 29 сьнежня мера стрыманьня журналістцы была зьмененая на падпіску аб нявыезьдзе.

31 сакавіка яна павінна была зьявіцца ў КДБ у Мінску. Для гэтага ёй дазволілі выехаць з Кобрына, дзе пражывала пад падпіскай. Па словах маці, яна праводзіла дачку да вакзала і пасадзіла на цягнік увечары 30 сакавіка. З раніцы 31 сакавіка сувязь з Натальляй Радзінай адсутнічае.

**Генадзь Барбарыч, Мінск, Радыё Рацыя.** 01-04-2011

## Абмежаваны доступ да дэмакратычнх сайтаў

Дзяржаўная інспекцыя па электрасувязі ўнесла сайты Charter97.org і Belaruspartisan.org у сьпіс абмежаванага доступу. Зараз да іх ня будзе прамога доступу зь дзяржаўных установаў.

Генпракуратура 23 сакавіка 2011 года вынесла пастановы аб абмежаваньні доступу да незалежных навінавых сайтаў «Хартыя’97» і «Беларускі партызан». Падставай для блакаваньня непажаданых сайтаў выстаўляюць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь».

На думку пракуратуры, гэтыя сайты парушылі частку 2 артыкулу 8 «Да атрыманьня дазволу на правядзеньне масавага мерапрыемства яго арганізатар (арганізатары), а таксама іншыя асобы ня маюць права абвяшчаць у сродках масавай інфармацыі аб даце, месцы і часу яго правядзеньня, вырабляць і распаўсюджваць з гэтай мэтай ўлёткі, плакаты і іншыя матар’ялы». Магчыма, гаворка ідзе аб абвестках пра Плошчу і Дзень Волі.

З 7 красавіка большасць беларускіх інтэрнэт-правайдэраў атрымалі абноўлены сьпіс абмежаванага доступу і абавязаны ў адпаведнасьці з указам № 60 заблакаваць доступ да гэтых сайтаў для дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама арганізацый адукацыі і культуры.

**Крыніца:** *Наша Ніва*, Сяргей Гезгала , 11 красавіка 2011

## Кіраўнікі сілавога блёку павінны былі самі падаць заяву аб адстаўцы

Наколькі адэкватна гучаць вэрсіі тэракту, якія былі агучаныя старшынём КДБ Беларусі? Наколькі праўдападобнымі выглядаюць прадстаўленыя вэрсіі? Ці можа Аляксандар Лукашэнка выкарыстаць гэтую сытуацыю для радыкальных кадравых зьменаў у кіраўніцтве сілавых структур? На гэтыя пытаньні адказвае шэф-рэдактар газэты *Народная воля* Сьвятлана Калінкіна.

**Цыганкоў:** Як выглядаюць тыя вэрсіі, якія былі прадстаўленыя грамадзкасьці?

**Калінкіна:** Шчыра кажучы, апошняй заявай старшыні КДБ пра тры вэрсіі, я проста зьбянтэжаная. Бо, на мой погляд, гэта проста несур’ёзная вэрсія. Калі казаць пра вэрсію нумар адзін, што нехта паспрабаваў узарваць стабільнасьць у Беларусі гэтым тэрактам, дык гэта, мне здаецца, відавочна кожнаму, хто чуў пра тое, што адбылося. Таму нічога новага старшыня КДБ увогуле не агучыў, хаця ўчора атрымаў загад працаваць канкрэтна.

Другая вэрсія — нібыта гэта ўчыніў нехта пакрыўджаны. З намёкамі на анархістаў і з намёкамі на тых, хто быў затрыманы пасьля падзеяў 19 сьнежня. Гэтая вэрсія ўвогуле несур’ёзная, бо адны з гэтых людзей сядзяць у СІЗА, іншыя знаходзяцца пад сталым наглядам.

Альбо спэцслужбы ў разгубленасьці ад таго, што адбылося, альбо яны проста ня хочуць нам гаварыць пра тыя вэрсіі, над якімі працуюць.

Трэцяя вэрсія пра нездаровага чалавека таксама, на мой погляд, не гаворыць пра прафэсійнасьць.

Таму нам застаецца толькі здагадвацца, альбо спэцслужбы ў разгубленасьці ад таго, што адбылося, альбо яны проста ня хочуць нам гаварыць пра тыя вэрсіі, над якімі працуюць.



*Сьвятлана Калінкіна*

**Цыганкоў:** Выглядае, што зараз у Аляксандра Лукашэнкі ёсьць шырокі выбар магчымасьцяў. Ён можа наладзіць кадравую чыстку ў сілавых структурах, ён можа ў залежнасьці ад сытуацыі «прызначыць» вінаватых у гэтых выбуху..

**Калінкіна:** Шчыра кажучы, на каго б ні ўскладаць адказнасьць — на замежныя сілы, на ўнутраныя, на хворых людзей, — дапусьцілі гэты тэракт сілавікі. І на мой погляд, кіраўнікі сілавога блёку павінны былі самі падаць заяву аб адстаўцы. Бо ў самым дурным сьне немагчыма было ўявіць, што ў Менску могуць адбывацца такія падзеі. Бо ніякіх падставаў для тэрактаў у Беларусі няма — у нас няма тэрарыстычных арганізацый, міжнацыянальных, рэлігійных канфліктаў.

Таму тут цалкам віна на сілавіках. Яны займаліся апошні час ня той справай. Вось гэты палітычны вышук, якім толькі і займаліся органы, у тым ліку і прывёў да таго, што адбылося. Бо трэба было займацца сапраўднымі злачынцамі.

**Крыніца:** Радыё Свабода**,** Віталь Цыганкоў, 12.04.2011

## Глеба для сумненьняў

**Валянцін СЫЧ**

Сярод шматлікіх каментатараў сітуацыі вакол тэракту ў менскім метро ўвагу прыцягваюць ветэраны расійскіх спецслужбаў. Здаецца, яны ня надта вераць афіцыйнай версіі пра “токараў-экстрэмістаў”.

Так, віцэ-прэзідэнт міжнароднай асацыяцыі ветэранаў падразьдзялення антытэрору “Альфа” **Аляксей Філатаў** заявіў **РІА “Навіны”**, што тэракт у Мінску быў праведзены “дастаткова граматна і ўзважана”, з выкарыстаньнем якаснай выбухоўкі. Наўрад ці звычайныя рабацягі з Віцебска былі здольны арганізаваць яго ўласнымі сіламі.

— Я дагэтуль няўпэўнены, і гэтая няўпэўненасьць расьце (пасьля таго, як мы атрымліваем розныя блытаныя каментары ад службаў бясьпекі Беларусі), што будзе знойдзены замоўца, — адзначыў Філатаў.

На ягоную думку, захоўваецца пагроза таго, што тэракты ў Беларусі адбудуцца зноў. Аб гэтым, паводле Філатава, сведчаць і бяспрэцэдэнтныя захады па бясьпецы, якія ажыцьцяўляюцца дагэтуль. “Даглядаюцца людзі ня толькі пры ўваходзе ў метро, але і пры ўезьдзе і выезьдзе зь Менску ды іншых гарадоў, і наогул у Рэспубліку Беларусь. Значыць, у структур бясьпекі ёсьць нейкая інфармацыя, якую, відаць, яны ўтойваюць”, — кажа ветэран “Альфы”.

Філатаў разважае ў парадыгме, характэрнай для расійскіх спецслужбаў. Апошнім звычайна даводзіцца сутыкацца з тэрактамі, адказнасьць за якія ўскладаецца на лідараў каўказскіх баявікоў. Адпаведна Філатаў лічыць, што і ў Беларусі нехта замовіў “пахавальны марш” для менскай падземкі.

Што тычыцца “бяспрэцэдэнтных захадаў па бясьпецы”, то яны, магчыма, маюць значна прасьцейшае тлумачэньне: пасьля выбуху праваахоўным органам карціць прадэманстраваць грамадзтву сваю бурную дзейнасьць, у тым ліку праз стварэньне “карцінкі” з доглядамі ў метро ды інш.

Самае цікавае ў каментары Філатава тое, што, нават не зважаючы на карпаратыўную салідарнасьць, ён дэ-факта ставіць пад сумненьне афіцыйную версію беларускага боку, згодна з якой тэракт у метро ляжыць на сумленьні токара, які неадэкватна высока ацэньваў сябе і праз гэта зьбіраўся забіць шмат людзей, у тым ліку сваіх сяброў.

Скепсіс расійскага ветэрана падзяляе шмат хто і ў Беларусі. З улікам таго, што затрыманым (якім сёньня менш за 25 год) ужо інкрымінуюцца таксама выбухі ў 2005 і 2008 гадах, атрымліваецца, што сваю тэрарыстычную дзейнасьць яны пачалі на мяжы паўналецьця і амаль 6 гадоў заставаліся недасягальнымі для МУС, КДБ ды іншых спецслужбаў, а потым раптам у адзін дзень нарабілі безьліч дурных памылак і былі імгненна арыштаваныя.

Падазрэньні выклікае і тое, што ўлады пачалі выкарыстоўваць тэракт у палітычных мэтах. З аднаго боку, ёсьць канкрэтныя затрыманыя, да якіх павінны былі б і адрасавацца ўсе прэтэнзіі. Аднак замест гэтага да справы аб выбуху спрабуюць нейкім чынам прывязаць апазіцыю. Больш за тое, сам Аляксандр Лукашэнка аб’яднаў у адзін ланцуг такія падзеі, як пасьлявыбарныя пратэсты, валютны крызіс, цукрова-алейны ажыятаж і тэракт у падземцы. Маўляў, нас зноў спрабуюць “нахіліць”.

Але ні апазіцыя, ні тэрарысты ня ў стане ўплываць на валютны ды харчовы рынкі краіны. Дык навошта валіць усё ў адну кучу?

Выглядае так, што ўлады жадаюць скарыстацца трагічнымі падзеямі ў метро такім чынам, каб сьпісаць на іх адказнасьць за ўсе ўласныя правалы.

**Крыніца:** Вэб-старонка **ТУТ і ЦЯПЕР** ( http://svabodaby.net/ ), 19 красавіка 2011

## Першы раз за 20 год грамадзтва не праводзіць “Чарнобыльскі Шлях”

Арганізатары «Чарнобыльскага шляху» прынялі рашэнне аб зборы яго ўдзельнікаў 26 красавіка ў Мінску на плошчы Бангалор, паведаміў адзін з арганізатараў акцыі палітык Віктар Івашкевіч.

Паводле яго слоў, такое рашэньне было прынята, каб не правакаваць сілавыя структуры Беларусі на актыўныя дзеяньні ў дачыненьні да ўдзельнікаў мерапрыемства. Акрамя таго, адзначыў Івашкевіч, супрацоўнікі праваахоўных

органаў ня будуць перашкаджаць праходжаньню грамадзян да Чарнобыльскай капліцы на вуліцы Карастаянавай у Мінску.

«Аднак гэтае шэсьце ня будзе арганізаваным. Любы грамадзянін як прыватная асоба можа адправіцца ў бок Чарнобыльскай капліцы, ускласьці там кветкі, паставіць свечкі. Аб гэтым нам было заяўлена сёньня на сустрэчы з кіраўніцтвам мінскай міліцыі», — паведаміў Івашкевіч.

Такім чынам, мітынг пройдзе на плошчы Бангалор у 18 гадзін 26 красавіка.

Раней Мінгарвыканкам забараніў правядзеньне 26 красавіка ў Мінску шэсьця «Чарнобыльскі шлях». Арганізатарам было паведамлена, што збор удзельнікаў акцыі на пляцоўцы каля прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук забаронены. Забаронена таксама шэсьце да Чарнобыльскай капліцы на вуліцы Карастаянавай. У Мінгарвыканкаме матывавалі гэтае рашэньне законам аб масавых мерапрыемствах, згодна зь якім акцыі ня могуць праходзіць бліжэй чым за 200 метраў ад уваходаў у метро і адміністрацыйных будынкаў.

Мінгарвыканкам прапанаваў правесьці 26 красавіка толькі мітынг у парку Дружбы народаў з 18 да 20 гадзін.

«Чарнобыльскі шлях» — традыцыйнае шэсьце, якое праводзіцца ад 1989 году.

Яно бывала больш ці менш шматлюдным, але яно заўжды было прынцыповым для апазіцыі. Ня раз улады забаранялі яго, але яно праводзілася тады без дазволу — напрыклад, ад плошчы Свабоды ці ад Акадэміі навук.

Сёлета першы год, калі градус страху ў грамадстве такі, што ніхто з палітыкаў ці грамадскіх дзеячоў ня ўзяў на сябе адказнасьць за збор людзей у недазволеным месцы.

Многія грамадскія лідары зьняволеныя, іншыя знаходзяцца пад следзтвам. Лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заклікаў апазіцыйных палітыкаў на 26 красавіка наведаць Чарнобыльскую зону. На ягоную думку, у атмасферы пасля тэракту ўлады ня далі б дазволу ні на якую вулічную акцыю ў цэнтры Мінска.

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 26 красавіка, 2011

## Беларусь у сьвеце

## Гілары Клінтан: Наста Палажанка не спалохалася

**20-гадовая Наста Палажанка стала першай беларускай, узнарагоджанай прэстыжнай Міжнароднай жаночай прэміяй за мужнасьць, якую Дзяждэпартамэнт ЗША прысуджае штогод 10 жанчынам розных узростаў і нацыянальнасьцяў. Цырымонія ўзнагароджаньня прайшла 8 сакавіка ў Вашынгтоне.**

Дзяржаўны сакратар ЗША, **Гілары Клінтан,** якая ўручала ўзнагароды, выказала шкадаваньне ў сувязі з тым, што **Наста Палажанка** і **Ёані Санчэз** з Кубы ня здолелі прыехаць на цырымонію, бо ўлады іх краінаў ім гэтага не дазволілі. Клінтан сказала:

”Наста Палажанка зь Беларусі жыве ў складаны час. Краіна ў цэнтры Эўропы дагэтуль прыгнятае свой народ, фальсыфікуе выбары, самым жорсткім і брутальным чынам зьняволвае палітычных апанэнтаў, каб іх папалохаць. Але яна не спалохалася й выказала сваю пазыцыю.”

**Крыніца:** Радыё Свабода, 9 сакавіка 2011

## Дзень Волі - у замежжы

**1. У краінах Эўропы:**

* Польшча

- канцэрт «Салідарныя зь Беларусьсю» адбыўся 27-га сакавіка ў Варшаве, Катавіцах і Беластоку. Выступалі гурты зь Беларусі -«Крама» і «Рэха.»
- у Гданьску адбыўся «Канцэрт Свабоды,» на якім выступалі бард Зьміцер Вайцюшкевіч і гурт «Рэха.»
- у Лодзі адбылася акцыя салідарнасьці зь беларускімі палітвязьнямі.

* у Летуве

- у Вільні, 26-га сакавіка, Таварыства Беларускай Культуры (ТБК), разам са Згуртаваньнем Беларускіх Грамадзкіх Арганізацыяў, правяла сьвяточную акадэмію. На ёй выступалі: Артур Яўмен, з дакладам пра падзеі 25-га сакавіка 1918 году, Алена Базюк пра жыцьцё й творчасьць Максіма Багдановіча, і студэнт ЭГУ, Уладзіслаў Гурыновіч, пра падзеі плошчы 19-га сьнежня 2010 г., і 25-га сакавіка 2011 г., якіх быў сам удзельнікам.

* у Расіі

- Беларусы Калінінграду адсьвяткавалі Дзень Волі ля помніка Францішка Скарыны

* на Ўкраіне

- у Кіеве беларускія актывісты наладзілі пікет ля пасольства Беларусі.
- у Сэвастопалі быў праведзены такі-ж пікет сябрамі беларускага таварыства імя М. Багдановіча «Пагоня»

* у Францыі

- У Парыжы быў наладжаны пікет ля пасольства Беларусі.

* У Вялікабрытаніі

- у Лёндане, адбылася ўрачыстая акадэмія, арганізаванае супольна Згуртаваньнем беларусаў у Вялікабрытаніі і Англа-беларускім Таварыствам.

' У Швэцыі

- у Стакгольме, 26-га сакавіка суполка «Беларусы Швэцыі» правяла сьвяточную вечарыну.

* У Латвіі

- у Рызе, таварыства беларускае культуры «Сьвітанак» наладзіла ўрачыстую акадэмію . Пасьля віншавальных выступаў адбыўся канцэрт ансамблю беларускай песьні «Вытокі.»

* у Бэльгіі

- У Антвэрпэне, 26-га сакавіка беларусы Бэльгіі, Францыі й Нямеччыны сабраліся разам, каб адзначыць Дзень Волі.

Пасьля акадэміі ўдзельнікі накіраваліся на могілкі, дзе пахаваны радны БНР, сьв. памяці Янка Жучка. Там адбылася сустрэча зь ягонымі роднымі, і была адпраўлена паніхіда за супакой ягонай душы і душы ўсіх спачылых беларускіх дзеячоў.

**2. На кантынэнце Паўночнае Амэрыкі**

* у Канадзе

- У Таронта сьвята было адзначана мітынгам у цэнтры гораду.

На сьвяточнай імпрэзе выступілі прафэсар тутэйшага ўнівэрсытэту, Зінаіда Гімпелевіч, і сп. Алесь Кот.

- Сьвяточныя імпрэзы адбыліся таксама ў Монрэалі, і Атаве.

* у Злучаных Штатах Амэрыкі (ЗША)
- паасобныя аддзелы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА) ладзілі сьвяточныя акадэміі 27-га сакавіка:
- у Брукліне ( частцы гораду Нью Ёрк). Выступалі - сп. Зянон Пазьняк , які распавёў пра адраджэньне незалежнасьці ў пачатку 1990 год, сп-ня Галіна Падлеская, з рэфэратам пра падзеі 1918 году ў Менску, і сп. Вячка Станкевіч, старшыня БАЗА, пра сучасную дзейнасьць Рады БНР.
- у Нью-Брансўіку ( штат Нью Джэрзі), аддзелы БАЗА ў Нью Ёрку й Нью Джэрзі, разам зь Беларускім Моладзевым Рухам Амэрыкі наладзілі ўрачыстую акадэмію, з багатай мастацкай часткай, і банкетам.



*Нью-Брансўік, удзельнікі акадэміі*

Сьвяточныя імпрэзы былі таксама наладжаныя аддзеламі БАЗА ў Вашынгтоне (сталіцы ЗША), Кліўлендзе (штат Огаё), і ў Лёс Анджэлес ( паўдзённая Каліфорнія).
**Крыніца:** Інфармацыйны цэнтар ЗБС “Бацькаўшчына”

## Сьвет спачувае Беларусі

**У зьвязку з выбухам 11 красавіка ў менскім мэтро кіраўнікі краін і міжнародныя арганізацыі, вядомыя людзі выказваюць спачуваньне пацярпелым і ўсяму беларускаму народу.**

Генэральны сакратар ААН **Пан Гі Мун** выказаў спачуваньне народу Беларусі і, у прыватнасьці, сем’ям ахвяраў.

Дзейны старшыня АБСЭ, міністар замежных справаў Літвы **Аўдронюс Ажубаліс**: “Наша спачуваньне накіраванае ў першую чаргу сем’ям загінулых і пацярпелых”.

Сёньня ранішняе паседжаньне Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы пачалося зь хвіліны маўчаньня у памяць ахвяраў тэракту ў менскім мэтро.

У Люксэмбургу, адкрываючы пасяджэньне Рады міністраў замежных справаў Эўразьвязу, вярхоўны прадстаўнік Эўразьвязу ў пытаньнях замежнай палітыкі **Кэтрын Эштан** сказала: “Я перадала свае спачуваньні сем’ям, якія страцілі сваіх любімых або маюць параненых у выніку таго, што адбылося ў Беларусі”.

Свае спачуваньні ў тэлефоннай размове з А.Лукашэнкам выказаў прэзыдэнт Расеі **Дзьмітры Мядзьведзеў**.

Тэлеграмай прыслаў свае спачуваньні прэзыдэнт Казахстану **Нурсултан Назарбаеў**.

Спачуваньні народу Беларусі выказалі арганізацыі нацыянальных мяншыняў Малдовы.

На адрас МЗС РБ паступілі спачуваньні ад міністра замежных справаў Ізраіля **Авігдора Лібэрмана**, міністра замежных справаў Латвіі **Гірта Валдзіса Крыстоўскіса**, міністра замежных справаў Польшчы **Радаслава Сікорскага**, кіраўніка МЗС Фінляндыі **Аляксандра Стуба**, міністра замежных справаў Эстоніі **Урмаса Паэта**, эўракамісара па пашырэньні і эўрапейскай палітыцы суседзтва **Штэфана Фюле**.

У зьвязку з трагедыяй у мэтро спачуваньні беларускаму народу выказаў прэзыдэнт Украіны **Віктар Януковіч**.

Пра тое, што Летува асуджае любую праяву гвалту, тым больш, калі гэта адбываецца ў блізкіх суседзяў, заявіў прэм’ер-міністар Летувы **Андрус Кубілюс**.

Далучыўся да спачуваньняў і прэм’ер-міністар Малдовы **Ўладзімер Філат**.

Ад імя Кітаю тэракт у менскім мэтро рашуча асудзіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР **Хун Лэй**.

Спачуваньні сем’ям ахвяраў выказаў прэзыдэнт Латвіі **Валдзіс Затлерс**.

“Мы смуткуем разам з вамі ў гэты цяжкі час”, -- сказана ў спачуваньні прэзыдэнта Эстоніі **Томаса Хендрыка Ільвеса**.

Свае словы падтрымкі народу Беларусі даслаў выканаўца абавязкаў прэзыдэнта Малдовы **Марыян Лупу**.



Спачуваньні А.Лукашэнку даслаў прэзыдэнт Грузіі **Міхаіл Саакашвілі**.

Праз наша радыё выказаў спачуваньне **Зянон Пазьняк**: "Маё глыбокае спачуваньне сем’ям, родным і блізкім усіх загінулых добрых нашых людзей ад выбуху 11-га красавіка ў Менскім мэтро. Спачуваю таксама ўсім пакалечаным і параненым, зычу хутчэйшага загойваньня і выздараўленьня і спадзяюся, што цемра і страх зьнікнуць з нашага беларускага жыцьця і людзі дамогуцца лепшай долі".

У сваёй заяве **Рада Беларускай Народнай Рэспублікі** выказала спачуваньне родным і блізкім загінулых і пацярпелых у выніку выбуху ў менскім мэтрапалітэне 11 красавіка: “Гэтая жудасная трагедыя кранае ўсіх беларусаў, і тых, хто на Бацькаўшчыне, і тых, хто на чужыне. Мы молімся па памерлых і жадаем хутчэйшага выздараўленьня параненым”.

**Амбасада ЗША** выказала спачуваньне ў сувязі з тэрактам у менскім мэтро: «Мы самым рашучым чынам асуджаем гэты подлы і жахлівы акт. Мы жадаем усім параненым поўнага і хуткага выздараўленьня».

Дзярждэпартамэнт ЗША асудзіў выбух у менскім мэтро і выказаў спачуваньні сем'ям ахвяраў. "Мы асуджаем гэты жахлівы ўчынак, які дэманструе абсалютную пагарду да чалавечага жыцьця", – сказаў на брыфінгу прэсавы сакратар Дзярждэпу **Марк Тоўнэр**.

**Крыніца:** Радыё Свабода, 12 красавіка 2011

# Беларусы Эўразьвязу

## САПРАЎДНАЕ ЗАСТАНЕЦЦА!

У лютым месяцы ў Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве адбылося мерапрыемства прысьвечанае дзеячам, якія нарадзіліся ў гэтым месяцы. На апошняй радзе ТБК старшыня прапанаваў , што кожны месяц за мерапрыемства будзе адказваць адзін з чальцоў рады. У гэтым месяцы быў адказны Алесь Адамковіч. Праграма атрымалася вельмі багатая. У хуткім часе катэдра беларусістыкі адзначае 20-годдзе дзейнасьці ў Літве. Першай выступіла загадчыца катэдры

Лілея Плыгаўка. "Мы жывём у вельмі цікавы час і на ўнікальнай тэрыторыі, якая называецца Віленскі край. Побач жывуць лрадстаўнікі розных нацыянальнасьцяў: палякі літоўцы, беларусы, караімы і другія , адбываецца ўплыў розных культур, моў, рэлігій. Тыповы жыхар гэтага рэгёна валодае некалькімі мовамі, ўжывае словы з іншых моў, адбываецца цеснае культурнае перапляценьне.

Каля Вільні ёсьць вёска Ашашнікі, ў якой жывуць у асноўным жанчыны беларускі, а мужчыны літоўцы.

Яшчэ ў гэтым рэгіёне існуе такі ўнікальны феномен, як "тутэйшы". я"тутэйшы" жыхар, мая мова "тутэйшая". У гэтым рэгіёне ніколі не было міжнацыянальных канфліктаў. На гэтай тэрыторыі пражывае шмат беларусаў, іх можна падзяліць на две часткі- аўтахтоны, якія тут нарадзіліся, і тыя, хто прыехаў у пасьляваенны перыяд. У пасьляваенны перыяд у Літве ня існавала ні адной навучальнай установы на беларускай мове. Дзякуючы перабудове ў канцы 80-х гадоў , у Літве пачалі ўзьнікаць першыя беларускія суполкі; "Сябрына", Таварыства Беларускай Культыры, адкрыўся першы беларускі клас пры 13 школе, калі набралася больш 200 заяў ад бацькоў, паўстала пытаньне сваёй школы.

Дзякуючы намаганьням Хведара Нюнькі, Лявона Луцкевіча, Лілеі Плыгаўкі памяшканьне было атрымана, пачала працаваць Віленская беларуская школа № 69, цяпер школа імя Францыска Скарыны, адбылося ўжо 17 выпускаў. Пасьпяхова працуе і кафедра беларусістыкі пры педагагічным універсітэце, яе бяссменна ўзначальвае доктар навук Лілея Плыгаўка. У 2009 годзе выйшла кніга Л.Плыгаўкі "Беларуская мова ў Літве: сацыякультурны і лінгвістычны асьпекты", дапаможнік для студэнтаў і для тых, хто цікавіцца беларускай мовай.

Выпускнікі атрымоўваюць добрую адукацыю, валодаюць некалькімі эўрапейскімі мовамі, многія займаюцца прафесійна журналістыкай, ёсьць выкладчыкі, перакладчыкі і.г.д

Наступны выступоўца- чалец ТБК, войт Вацлаў Гульбіновіч. Яго сенюнія па выніках працы займае першае месца ў горадзе сярод 21. Сп.В. Гульбіновіч падрабязна распавёў пра сваю працу, нават было шмат пытаньняў.

Сп. Алесь Адамковіч займаецца дасьледаваньнем жыцьця і дзейнасьці беларускіх сьвятароў. Гэтым разам ён распавёў пра жыцьцядзейнасьць Тамаша Падзявы, нарадзіўся 5 лютага 1906г і пра Янку Быліну ( Ян Семашкевіч), памёр 18 лютага 1956 году. Абодва працавалі на карысьць Бацькаўшчыны, стараліся данесьці слова Божае да сваіх прыхаджан на роднай мове, абодва і пацярпелі, адбывалі пакараньне ў сталінскіх лагерах.. Янка Быліна нарадзіўся на памежжы, цяпер Астравецкі раён, служыў ў Лаварышках. Кажуць, што 20 гадоў таму бабулькі Лаварыскага прыходу сьпявалі каталіцкія песьні на беларускай мове і казалі, што іх навучыў ксёндз Ян Семашкевіч.

Вельмі цікавы і зьмястоўны даклад Артура Яўмена, прысьвечаны Тадэвушу Касьцюшку, нарадзіўся 4 лютага 1746 году. Вельмі цікавае выступленьне і Анатоля Уласенкі пра графа Канстанціна Тышкевіча, нарадзіўся 17 лютага 1806 года ў Лагойску..Першым праплыў 682 вярсты па Вяльлі ад вёскі Каменкі, пад час вандроўкі рабіліся замалёўкі, вынікам стала кніга К. Тышкевіча “Вілія і яе берагі”, якая выйшла пасьля сьмерці аўтара ў Дрэздэне. Кніга цікавая і сучасьнікам. У пачатку 21 стагоддзя зноў праплылі шляхам графа К.Тышкевіча.

Сп. Хведар Нюнька сваё выступленьне прысьвяціў гісторыку, грамадзкаму і палітычнаму дзеячу Усеваладу Ігнатоўскаму, загінуў 4 лютага 1931 году. Выступоўца падрабязна распавёў пра біяграфію, і дзейнасьць У.Ігнатоўскага, зачытаў з "Гісторыі Беларусі" ( 2007г.).пра вялізную працу па беларусізацыю і плату за гэта сталінскім рэжымам.

8 лютага 1921года нарадзіўся Іван Мележ, аўтар "Палескай хронікі". У 1885 годзе Марк Твэн пісаў;"Ёсьць толькі адзін эксперт, які прафесійна валодае кваліфікацыяй, дастатковай, каб зраэумець душу і жыцьцё народа і адэкватна іх ацаніць - гэта нацыянальны раманіст, якіх вельмі мала нават у шматлюднага народу. У 1914 годзе М. Гарэцкі марыў, каб побач з кнігай вершаў Янкі Купалы "Шляхам жыцьця" ляжала тоўстая кніга прыгожай прозы. Мы можам ганарыцца, што ў нас ёсьць "Каласы пад сярпом тваім", "Новая зямля", "Людзі на балоце". Такім нацыянальным раманістам быў Іван Мележ.

Мала ён пражыў, мог яшчэ шмат сказаць, але тое, што сказаў сапраўднае, а сапраўднае застанецца.

Пра І.Мележа расказала Леакадзія Мілаш. Праграма была вельмі багатай, адзначылі і прысутныя журналісты, нават не пасьпелі ўсё запланаванае ажыцьцявіць

Жыве беларускае слова ў Літве. Жыве Беларусь!

Леакадзія Мілаш, г. Вільня, люты 2011год

## Закон аб беларускай дыяспары

( заўвагі й прапановы )

Паважанае, спадарства.

Зьвяз Беларусаў Нямеччыны, які аб’ядноўвае толькі беларускіх палітычных уцекачоў, уважліва прааналізаваў праект Закону “Аб беларусах замежжа” і прышоў да высновы:

Згодна палітычнай сітуацыі у Беларусі, калі ва уладзе знаходзіцца нелегітымны, дыктатарскі рэжым (парлямент, прэзідэнт), прыньняцьце, у такім выглядзе, “Закону аб беларусах замежжа”, лічым дысрымінуючым -- згодна маралі і заўчасным -- па палітычных прыкметах.

**Заўчасным** - таму, што у сьвеце стала пражываюць, тысячы апанэнтаў існуючай улады і гэта ёсьць маральны фактар. Таму што палітычныя апанэнты не падпадаюць пад юрысдыкцыю гэтага Закону.

**Дыскрымінуючым** – таму, што беларускія палітычныя уцекачы, будуць пазбаўленыя магчымасьці кіраваца гэтым Законам.

Беларускім палітычным уцекачом у сьвеце, згодна Законаў краін, дзе яны стала пражываюць, забаронена наведваць Беларусь, а таксама карыстацца паслугамі беларускіх амбасадаў. Інакш яны губляюць статус "палітычнага уцекача".

І самае галоўнае, гэты Закон ня будзе спрыяць кансалідацыі беларускай дыяспары у сьвеце, а наадварот **стане раз'яднаючым фактарам**, па прыкметах лаяльнасьці да рэжыму. Што практычна цяпер і адбываецца, ва усіх краінах сьвету, дзе існуюць беларускія дыяспары, таму ёсьць шматлікія прыклады.

Просім, давесьці да сяброў Вялікай Рады, што сябры Зьвязу Беларусаў Нямеччыны лічаць неабходным, на пэўны час, прыпыніць суправаджэньне гэтага Закону, пакуль у Беларусі ня ўсталюецца дэмакратычнае грамадзтва і толькі пры гэтых умовах, Закон будзе адпавядаць рэчаіснасьці.

З павагай.

Яўген Мурашка, старшыня ЗБН, Нямеччына.

28.12.2010 году

## СПОРТ

# Вікторыя Азаранка выйграла турнір у Маямі

**21-гадовая беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (8-е месца ў сусветным рэйтынгу) выйграла турнір у Маямі (ЗША) з прызавым фондам 4,5 млн. долараў.**

2 красавіка ў вырашальным матчы яна перамагла расіянку зь беларускімі каранямі Марыю Шарапаву (13) — 6:1, 6:4. Сустрэча працягвалася 1 гадзіну 46 хвілін.




*Вікторыя Азаранка*

Першы гейм (на падачы Шарапавай) працягваўся 10 хвілін. Расіянка павяла 40:15, а ўсяго мела чатыры гейм-болы, але розыгрыш застаўся за Азаранкай, якая рэалізавала трэці брэйк-пойнт. У наступным гейме Шарапава даволі хутка зрабіла брэйк у адказ, аднак беларуская тэнісістка ўзяла наступныя дзевяць геймаў, выйграўшы першую партыю 6:1 і павяла ў другой 4:0. У чацьвёртым гейме другога сэта Шарапава вяла 40:0 на сваёй падачы і яшчэ два разы мела "больш". У Азаранкі атрымалася рэалізаваць трэці брэйк-пойнт, прычым у двух апошніх розыгрышах яна зарабіла ачкі дзякуючы нет-болу (мяч, трапіўшы ў сетку, пераваліўся на палову корту саперніцы).

Шарапава здолела скараціць лік нявымушаных памылак і мінімізаваць адставаньне, зрабіўшы два брэйкі, — 3:4. У пятым гейме яна зрабіла брэйк, адыграўшы гейм-бол (пры 30:40), у сёмым спартсменка адыграла два гейм-болы (пры 30:40 і "менш"). Затым расійская тэнісістка зноў адпусьціла саперніцу: Азаранка рэалізавала брэйк-пойнт пасля яе двайной памылкі і павяла 5:3. Аднак вырашыць лёс фіналу на сваёй падачы беларуска не змагла, хоць мела два матч-болы (40:30 і "больш"). Дапусьціўшы двайную памылку, Азаранка зноў дазволіла Шарапавай паменшыць адрыў, але расіянка затым сваю падачу прайграла, а зь ёй і ўсю сустрэчу.

**Крыніца:** Эўрапэйскае Радыё для Беларусі, 03-04-2011

## Архівы беларускіх выданьняў на Сецівe

Дарагія суродзічы!

Гэты - апошні нумар **КРЫВІІ (№ 21)** ў фармаце PDF а таксама й папярэднія нумары (10-20) можаце лёгка сьцягнуць (спампаваць) з сеціўнай старонкі

**http://thepointjournal.com/**

## ВІНШУЕМ нашых сяброў з НАРОДЗІНАМІ!

**у ЛЮТЫМ**:
**Сьвету Гвазьдзіцкую, Мікалая Вінакурава**

**у САКАВІКУ**:
**Ганну Васілевіч, Любу Грунькоўскую, Натальлю Ратнікаву, Юлю Гладкую, Касю Палівада, Сяргея Макарава, Аляксея Францкевіча, Андрэя Бучу, Юрку Станкевіча, Віталя Воранава**

**у КРАСАВІКУ**:
**Жану Віткоўскую, Кацю Навуменка, Надзю Шчарбакову**

**у ТРАЎНІ**:
**Алесю Вінакураву, Віталя Цімошчанку Андрэя Навуменку, Алеся Гладкага**

**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**
Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі
MK ČR E 16919
РЭДАКЦЫЯ
Юрка Станкевіч
Ганна Васілевіч
Адрас рэдакцыі: Časopis KRYVIJA
ul. Malešická 553/65, 108 00 Praha 10